Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Установа адукацыі “Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт
імя П.М. Машэрава”

В.Ф. Падстаўленка

# ТЭОРЫЯ ЖАНРУ І СТЫЛЮ

**Метадычныя рэкамендацыі**

*Віцебск*
*ВДУ імя П.М. Машэрава*
*2013*

Репозиторий ВГУ

**ББК 83.0я73**
УДК 82-1/-9 (075.8)
П12

Репозиторий ВГУ

Друкуецца па рашэнні вучэбна-метадычнага савета ўстановы адукацыі "Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава".

Аўтар: кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускай літаратуры **Падстаўленка В.Ф.**

Р э ц э н з е н т : доктар філалагічных навук, прафесар кафедры беларускай літаратуры В.Ю. Бароўка

Падстаўленка, В.Ф.

**П12** Тэорыя жанру і стылю: Метадычныя рэкамендацыі / В.Ф. Падстаўленка. – Віцебск: ВДУ імя П.М. Машэрава, 2013. – 20 с.

Метадычныя рэкамендацыі прызначаны студэнтам-філолагам дзённага і завочнага аддзяленняў для вывучэння курса "Тэорыя жанру і стылю".

Вучэбнае выданне можа быць цікавым для настаўнікаў-філолагаў і літаратуразнаўцаў.

**ББК 83.0я73**
УДК 82-1/-9 (075.8)
П12

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Курс “Тэорыя жанру і стылю” тэматычна і фактуальна пашырае веды, набытыя студэнтамі па прафільных дысцыплінах, экстэнсіфікуе навуковыя ўяўленні па вызначальных тэарэтычных аспектах, уласцівых катэгорыям жанру і стылю.

***Мэта выкладання курса*** заключаецца ў азнаямленні студэнтаў-філолагаў з асноўнымі этапамі фарміравання катэгорый жанру і стылю, з гістарычна акрэсленай навуковай рэцэпцыяй названых літаратуразнаўчых аб’ектаў.

***Асноўныя задачы курса*** наступныя:

- варыянтна акрэсліць характар сусветнай навукова-тэарэтычнай думкі па пытаннях сутнаснага вызначэння катэгорый жанру і стылю, іх ролявых прызначэннях у літаратуры;
- у дыяхронным кантэксце раскрыць дынаміку жанраў і стыляў у беларускім прыгожым пісьменстве;
- акрэсліць перспектыўныя кірункі развіцця айчыннай жанралогіі і тэорыі стылю;
- ахарактарызаваць традыцыйныя, новыя і патэнцыяльныя жанравыя мадыфікацыі і дыскурсныя адметнасці, уласцівыя беларускай літаратуры XX – пач. XXI ст.;
- удасканаліць прафесійную падрыхтоўку спецыялістаў-філолагаў; замацаваць навыкі жанравага і стылявога аналізу мастацкіх тэкстаў.

Матэрыял метадычных рэкамендацый структураваны наступным чынам. Спачатку змешчаны кароткі лекцыйны блок, а таксама тэматычны змест лекцый, акрэсліваюцца пытанні для семінарскіх заняткаў, прапануецца тэарэтычны матэрыял для замацавання дысцыпліны, прыводзіцца пералік асноўнай і дадатковай навуковай літаратуры па дадзеным вучэбным курсе, уключаны пытанні да заліку.

Метадычныя рэкамендацыі “Тэорыя жанру і стылю” прызначаны студэнтам-філолагам для вывучэння названай дысцыпліны.

Репозиторий ВГУ

## КАРОТКІ КУРС ВЫБРАНЫХ ЛЕКЦЫЙ

## ГЕНЕЗІС ЖАНРАВА-СТЫЛЯВЫХ СТРУКТУР У СУСВЕТНЫМ МАСТАЦКІМ ПРАЦЭСЕ

**1. Эвалюцыя паняццяў *жанру і стылю*.**
**2. Сучаснае разуменне тэрмінаў.**
**3. Фактары і перадумовы фармавання жанрава-стылявой сістэмы ў сусветнай мастацкай практыцы.**
**4. Дэтэрмінізм катэгорый *жанр – стыль*, варыятыўнасць іх узаемадзеяння.**

***1.Эвалюцыя паняцця стыль***

Тэрмін *стыль* (гр. stylos – палачка для пісьма) выкарыстоўваецца ў розных навуках – лінгвістыцы, мастацтвазнаўстве, эстэтыцы, літаратуразнаўстве, ужываецца ў розных гістарычна зменлівых значэннях. Ужо ў антычную эпоху гэтае слова разумелася ў пераносным сэнсе, азначала почырк, асаблівасці пісьма. Гэтае значэнне ў цэлым захавалася і ў сучасным тэрміне.

Да сярэдзіны XVII ст. слова *стыль* выкарыстоўвалася перш за ўсё для характарыстыкі выразна-выяўленчых асаблівасцей мовы. Эстэтыка канца XVIII – пачатку XIX стст. надала паняццю *стыль* мастацтвазнаўчае адценне. Стыль пачаў разглядацца як уласцівасць не толькі слоўнага, але і любога іншага мастацтва: жывапісу, скульптуры, музыкі і інш.

На працягу XIX ст. тэрмін выкарыстоўвалі і мастацтвазнаўцы, і літаратары: апошнія – для азначэння індывідуальнай манеры літаратурнага пісьма, выражанай у моўнай форме.

У канцы XIX – пачатку XX ст. катэгорыя стылю становіцца цэнтральнай у працах прадстаўнікоў фармальнай школы ў мастацтвазнаўстве, найперш Г. Вёльфліна (“Асноўныя паняцці гісторыі мастацтва. Праблема эвалюцыі стылю ў новым мастацтве”) і А. Вальцеля (“Праблема формы ў паэзіі”).

На працягу XX ст. і да сучаснасці тэрмін набываў розныя адценні значэнняў, захоўваючы нязменнымі толькі прыкметы своеасаблівасці, непадабенства.

**2. Сучаснае разуменне тэрміна *стыль***

Для сучаснага разумення літаратурна-мастацкага стылю істотна наступнае: 1) стыль з’яўляецца выражэннем глыбокай арыгінальнасці, 2) ён валодае эстэтычнай дасканаласцю, 3) ён уяўляе сабой змястоўную форму, 4) з’яўляецца ўласцівасцю ўсёй мастацкай формы твора, а не толькі яго моўнага боку.

Сучаснае агульнае вызначэнне тэрміна стыль можна сфармуляваць такім чынам: гэта эстэтычнае адзінства ўсіх бакоў і элементаў мастацкай формы, якое валодае арыгінальнасцю і выражае пэўны змест. Стыль у такім разуменні супрацьпастаўлены бясстыльнасці (эстэтычнай невыразнасці) і эпігонскай стылізацыі ці эклектыцы (няўменню знайсці свой стыль).

Мастацкая форма ўяўляе сабой не набор асобных прыёмаў, а змястоўна абумоўленую цэласнасць, яе выражэннем і з’яўляецца катэгорыя *стылю*. Усе элементы формы падпарадкоўваюцца адзінай мастацкай заканамернасці, адзінаму прынцыпу арганізацыі.

Па прычыне таго, што стыль з’яўляецца не элементам, а ўласцівасцю мастацкай формы, ён не лакалізаваны, а існуе ва ўсёй структуры твора.

Рэпазіторый БДУ

Утваральныя прынцыпы стылю знаходзяцца практычна ў любым фрагменце тэксту, кожны тэкставы пункт нясе на сабе адбітак цэлага. Дзякуючы гэтаму стыль пазнавальны па асобным фрагменце.

**Пытанні для самаправеркі:**

1. У якіх навуках выкарыстоўваецца тэрмін *стыль* ?
2. Якое першапачатковае значэнне меў гэты тэрмін ?
3. Пералічыце найбольш значныя прыкметы літаратурна-мастацкага стылю ў сучаснай навуковай трактоўцы.

**Літаратура:**

1. Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі: У 5 т. – Мінск: Беларус. сав. энцыкл., 1984-1987. – Т. 5 / Рэдкал.: І.П. Шамякін (гал.рэд.) і інш. – 1987. – С. 473-476.

2. Литературный энциклопедический словарь / Под общ. ред.: В.М. Кожевникова, П.А. Николаева. – М.: Совет. энцикл., 1987. – С. 352-355.

## СТЫЛЕЎТВАРАЛЬНЫЯ ФАКТАРЫ І ЭЛЕМЕНТЫ

**1. Сістэма стылявых дамінант.**
**2. Стыль як вышэйшая эстэтычная якасць мастацкіх твораў.**
**3. Кампаненты стылю.**

### 1. Сістэма стылявых дамінант

Цэласнасць стылю з найбольшай дакладнасцю праяўляецца ў сістэме стылявых дамінант – якасных характарыстык стылю, у якіх выражаецца мастацкая своеасаблівасць. Здаўна літаратурная крытыка, эстэтыка, мастацтвазнаўства імкнуліся прапанаваць такія характарыстыкі, выкарыстоўваючы для азначэння стыляў наступныя вызначэнні: *лёгкі, цяжкі, вольны, просты, складаны, манументальны* і інш. Адна з найбольш абаснаваных спробаў сістэматызаваць стылявыя ўласцівасці – гэта тыпалогія “катэгорый стылю” А.М. Сакалова (“Тэорыя літаратуры”).

Даследчык лічыў, што “стылявыя катэгорыі выступаюць як з’явы мастацкага стылю, якія ахопліваюць усе элементы формы”. Сакалоў у якасці стылявых катэгорый разглядаў суб’ектыўнасць / аб’ектыўнасць, выяўленне (“изображение”) / экспрэсію, два тыпы мастацкай умоўнасці, манументальнасць / камернасць і інш.

Мастацкі свет твора будуецца па-рознаму. Найперш гэта датычацца выяўлення дынамікі і статыкі, вонкавага і ўнутранага. Калі пісьменнік звяртае асноўную ўвагу на статычныя моманты быцця, то гэтую асаблівасць можна назваць апісальнасцю. Адлюстраваны свет пры апісальнасці падрабязна дэталізаваны, а прадстаўленыя дзеянні і падзеі раскрываюць нязменны, устойлівы уклад жыцця персанажаў.

Аўтарская сканцэнтраванасць на ўзнаўленні вонкавай і часткова ўнутранай дынамікі называецца сюжэтнасцю. Сюжэтнасць выражаецца ў вялікай колькасці перыпетый, у напружанасці дзеяння, у яго дамінаванні над статычнымі момантамі, а таксама ў тым, што характары герояў і аўтарская пазіцыя праяўляюцца нават праз сюжэт.

Рэпазіторый ВДУ

Пісьменнік можа акцэнтаваць увагу на ўнутраным свеце персанажаў – яго пачуццях, думках, жаданнях – такую ўласцівасць стылю называюць псіхалагізмам.

У залежнасці ад тыпу мастацкай умоўнасці можна вылучыць дзве супрацьлеглыя стылявыя дамінанты: жыццепадабенства і фантастыку. Жыццепадабенства прадугледжвае захаванне агульных фізічных, псіхалагічных, прычынна-выніковых і іншых заканамернасцей.

Фантастыка парушае гэтыя заканамернасці, адлюстроўвае свет падкрэслена ўмоўным. Фантастычная вобразнасць неаднародна: яна можа здзяйсняцца ў формах гіпербалы (“Гарганцюа і Пантагруэль” Ф. Рабле), літоты (“Дзюймовачка” Г.Х. Андэрсена), гратэску (казкі М. Салтыкова-Шчадрына, “Хатка над балотцам” Я. Коласа), алагізму (“Нос” М. Гогаля, “Запіскі Самсона Самасуя” А. Мрыя). Межы паміж фантастыкай і жыццепадабенствам дастаткова рухомыя (“Пікавая дама” А. Пушкіна, “Лабірынты” В. Ластоўскага, “Нядоля Заблоцкіх” Л. Калюгі).

**Пытанні для самаправеркі:**

1. Кім была прапанавана тыпалогія “катэгорый стылю”?
2. Якія ёсць асноўныя стылявыя дамінанты ? Ахарактарызуйце іх.

**Літаратура:**

1. Введение в литературоведение. Литературное произведение: Основные понятия и термины: Учеб. пособие / Л.В.Чернец, В.С. Хализев, С.Н. Бройтман и др.; Под ред. Л.В. Чернец. – М.: Высш. шк., 1999. – 556 с.

## ТЭМАТЫЧНЫ ЗМЕСТ ЛЕКЦЫЙ

### Тэма № 1.
### Генезіс жанрава-стылявых структур у сусветным мастацкім працэсе

1. Эвалюцыя паняццяў *жанру* і *стылю*.
2. Сучаснае разуменне тэрмінаў.
3. Фактары і перадумовы фармавання жанрава-стылявой сістэмы ў сусветнай мастацкай практыцы.
4. Дэтэрмінізм катэгорый *жанр – стыль*, варыятыўнасць іх узаемадзеяння.

### Тэма № 2.
### Спецыфіка жанрава-стылявых структур

1. Тыпалагічнае і гістарычна-канкрэтнае ў жанраўтварэнні.
2. Амбівалентнасць жанравай прыроды.

### Тэма № 3.
### Жанравая трансфармацыя

1. Праблема жанравых межаў.
2. Уплыў сацыякультурнай сітуацыі і сусветнай жанрава-стылявой экспансіі на беларускую літаратуру (ад старажытнасці да сучаснасці).



Репозиторий ВГУ

**Тэма № 4.**
**Стылеўтваральныя фактары і элементы**

1. Сістэма стылявых дамінант.
2. Стыль як вышэйшая эстэтычная якасць мастацкіх твораў.
3. Кампаненты стылю.

**Тэма № 5.**
**Сістэматызацыя жанравых структур**

1. Навуковыя вопыты сістэматызацыі жанраў.
2. Заканамернасці фарміравання жанравых сістэм.
3. Праблема "сінтэтычных", змешаных жанраў.

**Тэма №6.**
**Жанравая актуальнасць**

1. Сувязь росквіту асобных жанраў з пэўным светапоглядным станам, філасофіяй эпохі.
2. Экстэнсіфікацыя жанравых форм у беларускай мастацкай практыцы XX – пач. XXI ст.

## ТЭМАТЫКА ПРАКТЫЧНЫХ ЗАНЯТКАЎ

### Тэма 1. Жанрава-стылявыя канцэпцыі С. Аверынцава, А. Адамовіча, М. Бахціна, Ю. Борава

ПЫТАННІ:

1. Навуковае бачанне С. Аверынцавым агульных законаў жанрава-стылявога развіцця.
2. Канструктыўныя падыходы да асэнсавання катэгорый *жанру* і *стылю* ў працах А. Адамовіча.
3. Традыцыйнае і арыгінальнае ў інтэрпрэтацыі М. Бахціным (П.Мядзведзевым) катэгорый *жанру* і *стылю*.
4. Жанрава-стылявая канцэпцыя Ю. Борава.

ЗАДАННІ:

1. Прааналізаваць навуковую працу С.С. Аверынцава "Поэтика ранневизантийской литературы" (1977), выявіць і ахарактарызаваць тэарэтычныя палажэнні даследчыка адносна катэгорый *жанру* і *стылю*.

2. Прааналізаваць навуковую працу А.М. Адамовіча "Шлях да майстэрства: Станаўленне мастацкага стылю К.Чорнага" (1958), выявіць і ахарактарызаваць тэарэтычныя палажэнні даследчыка адносна катэгорый *жанру* і *стылю*.

3. Прааналізаваць навуковую працу М.М. Бахціна "Проблемы поэтики Достоевского" (1972), выявіць і ахарактарызаваць тэарэтычныя палажэнні даследчыка адносна катэгорый *жанру* і *стылю*.

4. Прааналізаваць навуковую працу Ю.Б. Борава "Эстетика" (2002), выявіць і ахарактарызаваць тэарэтычныя палажэнні даследчыка адносна катэгорый *жанру* і *стылю*.

Рэпазіторый ВГУ

ЛІТАРАТУРА:

1. Аверинцев, С.С. Поэтика ранневизантийской литературы / С.С. Аверинцев. – М.: Наука, 1977. – 320 с.

2. Адамовіч, А.М. Шлях да майстэрства: Станаўленне мастацкага стылю К.Чорнага / А.М. Адамовіч. – Мінск: Выд-ва АН БССР, 1958. – 180 с.

3. Бахтин, М.М. Проблемы поэтики Достоевского / М.М. Бахтин. – М.: Художеств. лит., 1972. – 472 с.

4. Борев, Ю.Б. Эстетика / Ю.Б. Борев. – М.: Высш. школа, 2002. – С.77-87.

## Тэма 2. Жанрава-стылявыя канцэпцыі В. Вінаградава, М. Гуляева, П. Дзюбайлы, В. Жураўлёва

ПЫТАННІ:

1. Асноўныя палажэнні па тэорыі стылю і асновах жанралогіі ў працах В. Вінаградава.
2. Канструктыўныя падыходы да асэнсавання катэгорый *жанру* і *стылю* ў працах М. Гуляева.
3. Традыцыйнае і арыгінальнае ў інтэрпрэтацыі П. Дзюбайлам катэгорый *жанру* і *стылю*.
4. Навуковае бачанне В. Жураўлёвым агульных законаў жанрава-стылявога развіцця.

ЗАДАННІ:

1. Прааналізаваць навуковую працу В. Вінаградава “Проблема авторства и теория стилей” (1961), выявіць і ахарактарызаваць тэарэтычныя палажэнні даследчыка адносна катэгорый *жанру* і *стылю*.

2. Прааналізаваць навуковую працу В. Вінаградава “Сюжет и стиль: Сравнительно-историческое исследование” (1963), выявіць і ахарактарызаваць тэарэтычныя палажэнні даследчыка адносна катэгорый *жанру* і *стылю*.

3. Прааналізаваць навуковую працу М. Гуляева “Теория литературы” (1977), выявіць і ахарактарызаваць тэарэтычныя палажэнні даследчыка адносна катэгорый *жанру* і *стылю*.

4. Прааналізаваць навуковую працу П. Дзюбайлы “Праблема стылю ў сучаснай беларускай прозе” (1973), выявіць і ахарактарызаваць тэарэтычныя палажэнні даследчыка адносна катэгорый *жанру* і *стылю*.

5. Прааналізаваць навуковую працу В. Жураўлёва “У пошуку духоўных ідэалаў” (2000), выявіць і ахарактарызаваць тэарэтычныя палажэнні даследчыка адносна катэгорый *жанру* і *стылю*.

Репозиторий ВГУ

ЛІТАРАТУРА:

1. Виноградов, В.В. Проблема авторства и теория стилей / В.В. Виноградов. – М.: Гослитиздат, 1961. – 614 с.
2. Виноградов, В.В. Сюжет и стиль: Сравн.-ист. исслед. / В.В. Виноградов. – М.: Изд-во Акад. наук СССР, 1963. – 192 с.
3. Гуляев, Н.А. Теория литературы: Учеб. пособие для филол. специальностей ун-тов и пед. ин-тов / Н.А.Гуляев. – М.: Высш. шк., 1977. – 278 с.
4. Дзюбайла, П.К. Праблема стылю ў сучаснай беларускай прозе / П.К. Дзюбайла. – Мінск: Навука і тэхніка, 1973. – 176 с.
5. Жураўлёў, В.П. У пошуку духоўных ідэалаў: На матэрыяле беларус. літ. XIX-пач. XX ст. / В.П. Жураўлёў. – Мінск: Беларус. навука, 2000. – 191 с.

**Тэма 3. Жанрава-стылявыя канцэпцыі В. Каваленкі, Н. Капысцянскай, В. Кожынава, Л. Корань**

ПЫТАННІ:

1. Асноўныя палажэнні па тэорыі стылю і асновах жанралогіі ў працах В. Каваленкі.
2. Традыцыйнае і арыгінальнае ў інтэрпрэтацыі Н. Капысцянскай катэгорый *жанру* і *стылю*.
3. Канструктыўныя падыходы да асэнсавання катэгорый *жанру* і *стылю* ў працах В. Кожынава.
4. Навуковае бачанне Л. Корань агульных законаў жанрава-стылявога развіцця.

ЗАДАННІ:

1. Прааналізаваць навуковую працу В. Каваленкі “Вытокі. Уплывы. Паскоранасць” (1975), выявіць і ахарактарызаваць тэарэтычныя палажэнні даследчыка адносна катэгорый *жанру і стылю*.

2. Прааналізаваць навуковую працу Н. Капысцянскай “Жанровые модификации в чешской литературе: Период становления социалист. реализма” (1978), выявіць і ахарактарызаваць тэарэтычныя палажэнні даследчыка адносна катэгорый *жанру* і *стылю*.

3. Прааналізаваць навуковую працу В. Кожынава “Происхождение романа” (1963), выявіць і ахарактарызаваць тэарэтычныя палажэнні даследчыка адносна катэгорый *жанру* і *стылю*.

4. Прааналізаваць навуковую працу Л. Корань “Беларуская проза XX стагоддзя: Дынаміка жанравых структур” (1996), выявіць і ахарактарызаваць тэарэтычныя палажэнні даследчыка адносна катэгорый *жанру* і *стылю*.

ЛІТАРАТУРА:

1. Каваленка, В.А. Вытокі. Уплывы. Паскоранасць: Развіццё беларус. літ. XIX – XX стагоддзяў. – Мінск: Навука і тэхніка, 1975. – 336 с.

Репозиторий ВГУ

2. Копыстянская, Н.Ф. Жанровые модификации в чешской литературе: Период становления социалист. реализма. – Львов: Вища шк., 1978. – 260 с.
3. Кожинов, В.В. Происхождение романа. – М.: Совет. писатель, 1963. – 440 с.
4. Корань, Л.Дз. Беларуская проза XX стагоддзя: Дынаміка жанравых структур. – Мінск: ВПП "Новік", 1996. – 220 с.

### Тэма 4. Жанрава-стылявыя канцэпцыі Н. Лейдэрмана, Дз. Ліхачова, А. Лосева, Ю. Лотмана

ПЫТАННІ:

1. Асноўныя палажэнні па тэорыі стылю і асновах жанралогіі ў працах Н. Лейдэрмана.
2. Канструктыўныя падыходы да асэнсавання катэгорый *жанру* і *стылю* ў працах Дз. Ліхачова.
3. Традыцыйнае і арыгінальнае ў інтэрпрэтацыі А. Лосевым катэгорый *жанру* і *стылю*.

ЗАДАННІ:

1. Прааналізаваць навуковую працу Н. Лейдэрмана "Движение времени и законы жанра" (1982), выявіць і ахарактарызаваць тэарэтычныя палажэнні даследчыка адносна катэгорый *жанру* і *стылю*.

2. Прааналізаваць навуковую працу Дз. Ліхачова "Поэтика древнерусской литературы" (1984), выявіць і ахарактарызаваць тэарэтычныя палажэнні даследчыка адносна катэгорый *жанру* і *стылю*.

3. Прааналізаваць навуковую працу А. Лосева "Проблема художественного стиля" (1994), выявіць і ахарактарызаваць тэарэтычныя палажэнні даследчыка адносна катэгорый *жанру* і *стылю*.

ЛІТАРАТУРА:

1. Лейдерман, Н.Л. Движение времени и законы жанра / Н.Л. Лейдерман. – Свердловск: Сред.-Урал. кн. изд-во, 1982. – 256 с.
2. Лихачев, Д.С. Поэтика древнерусской литературы / Д.С. Лихачев. – Л.: Наука, 1984. – 295 с.
3. Лосев, А.Ф. Проблема художественного стиля / А.Ф. Лосев. – Киев: Киев. акад. евробизнеса, 1994. – 288 с.

### Тэма 5. Жанрава-стылявыя канцэпцыі А. Макарэвіча, Г. Няфагінай

ПЫТАННІ:

1. Традыцыйнае і арыгінальнае ў інтэрпрэтацыі А. Макарэвічам катэгорый *жанру* і *стылю*.
2. Канструктыўныя падыходы да асэнсавання катэгорый *жанру* і *стылю* ў працах Г. Няфагінай.



Репозиторий ВГУ

ЗАДАННІ:

1. Прааналізаваць навуковую працу А. Макарэвіча “В разных стилевых течениях: Проблема жанра и стиля в рассказах 20-х годов М. Горецкого и Т. Гартного” (1995), выявіць і ахарактарызаваць тэарэтычныя палажэнні даследчыка адносна катэгорый *жанру* і *стылю*.

2. Прааналізаваць навуковую працу А. Макарэвіча “Праблема жанравых мадыфікацый у беларускай прозе XIX – пачатку XX ст.” (1999), выявіць і ахарактарызаваць тэарэтычныя палажэнні даследчыка адносна катэгорый *жанру* і *стылю*.

3. Прааналізаваць навуковую працу Г. Няфагінай “Русская проза конца XX века” (2005), выявіць і ахарактарызаваць тэарэтычныя палажэнні даследчыка адносна катэгорый *жанру* і *стылю*.

ЛІТАРАТУРА:

1. Макаревич, А.Н. В разных стилевых течениях: Проблема жанра и стиля в рассказах 20-х годов М.Горецкого и Т.Гартного / А.Н. Макаревич. – Екатеринбург: УралПлюс, 1995. – 177 с.
2. Макарэвіч, А.М. Праблема жанравых мадыфікацый у беларускай прозе XIX – пачатку XX ст. / А.М. Макарэвіч. – Магілёў: Выд-ва Магілёўс. дзярж. ун-та, 1999. – 332 с.
3. Нефагина, Г.Л. Русская проза конца XX века / Г.Л. Нефагина. – Минск: Флинта, Наука, 2005. – 274 с.

## Тэма № 6. Жанрава-стылявыя канцэпцыі Г. Паспелава, В. Фрэйдэнберг

ПЫТАННІ:

1. Навуковае бачанне Г. Паспелавым агульных законаў жанрава-стылявога развіцця.
2. Асноўныя палажэнні па тэорыі стылю і асновах жанралогіі ў працах В. Фрэйдэнберг.

ЗАДАННІ:

1. Прааналізаваць навуковую працу Г. Паспелава “Проблемы литературного стиля” (1970), выявіць і ахарактарызаваць тэарэтычныя палажэнні даследчыка адносна катэгорый *жанру* і *стылю*.

2. Прааналізаваць навуковую працу Г. Паспелава “Теория литературы” (1978), выявіць і ахарактарызаваць тэарэтычныя палажэнні даследчыка адносна катэгорый *жанру* і *стылю*.

3. Прааналізаваць навуковую працу В. Фрэйдэнберг “Поэтика сюжета и жанра” (1997), выявіць і ахарактарызаваць тэарэтычныя палажэнні даследчыка адносна катэгорый *жанру* і *стылю*.

Репозиторий ВГУ

ЛІТАРАТУРА:

1. Поспелов, Г.Н. Проблемы литературного стиля / Г.Н. Поспелов. – М.: Изд-во Моск. ун-та, 1970. – 332 с.
2. Поспелов, Г.Н. Теория литературы / Г.Н. Поспелов. – М.: Высш. шк., 1978. – 351 с.
3. Фрейденберг, О.М. Поэтика сюжета и жанра / О.М. Фрейденберг. – М.: Лабиринт, 1997. – 448 с.

**Тэма № 7. Жанрава-стылявыя канцэпцыі Л. Цімафеева, В. Цюпы, А. Чычэрына, А. Яскевіча**

ПЫТАННІ:

1. Асноўныя палажэнні па тэорыі стылю і асновах жанралогіі ў працах Л. Цімафеева.
2. Традыцыйнае і арыгінальнае ў інтэрпрэтацыі В. Цюпам катэгорый *жанру* і *стылю*.
3. Канструктыўныя падыходы да асэнсавання катэгорый *жанру* і *стылю* ў працах А. Чычэрына.
4. Навуковае бачанне А. Яскевічам агульных законаў жанрава-стылявога развіцця.

ЗАДАННІ:

1. Прааналізаваць навуковую працу Л. Цімафеева “Основы теории литературы” (1976), выявіць і ахарактарызаваць тэарэтычныя палажэнні даследчыка адносна катэгорый *жанру* і *стылю*.

2. Прааналізаваць навуковую працу В. Цюпы “Художественный дискурс: Введение в теорию литературы” (2002), выявіць і ахарактарызаваць тэарэтычныя палажэнні даследчыка адносна катэгорый *жанру* і *стылю*.

3. Прааналізаваць навуковую працу А. Чычэрына “Очерки по истории русского литературного стиля: Повествовательная проза и лирика” (1977), выявіць і ахарактарызаваць тэарэтычныя палажэнні даследчыка адносна катэгорый *жанру* і *стылю*.

4. Прааналізаваць калектыўную навуковую працу “Стыль пісьменніка” (1974), выявіць і ахарактарызаваць тэарэтычныя палажэнні даследчыкаў адносна катэгорый *жанру* і *стылю*.

ЛІТАРАТУРА:

1. Тимофеев, Л.И. Основы теории литературы / Л.И.Тимофеев. – М.: Просвещение, 1976. – 548 с.
2. Тюпа, В.И. Художественный дискурс: Введение в теорию литературы / В.И.Тюпа. – Тверь: Издательство Тверского гос. ун-та, 2002. – 180 с.
3. Тюпа, В.И. Художественность литературного произведения / В.И.Тюпа. – Красноярск, 1987. – 238 с.
4. Чичерин, А.В. Очерки по истории русского литературного стиля: Повествоват. проза и лирика / А.В.Чичерин. – М.: Художеств. лит., 1977. – 445 с.
5. Стыль пісьменніка: Зб. арт. / Рэд.: В.В. Барысенка, П.К. Дзюбайла. – Мінск: Навука і тэхніка, 1974. – 448 с.

Репозиторий ВГУ

## ТЭАРЭТЫЧНЫ МАТЭРЫЯЛ ДЛЯ ЗАМАЦАВАННЯ ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

**1.** Дж. Свіфт казаў, што належнае слова ў належным месцы – вось сапраўднае вызначэнне стылю. Ф. Стэндаль сцвярджаў, што стыль ёсць максімальная эфектыўнасць думкі. Па Г. Флаберу, стыль – гэта манера бачыць. Ж. Бюфон адзначаў, што стыль ёсць сам чалавек.

**2.** М. Бахцін: твор любога жанру арыентаваны на пэўныя ўмовы ўспрыняцця: для кожнага літаратурнага жанру характэрны свае асаблівыя канцэпцыі адрасата твора, асаблівае адчуванне і разуменне свайго чытача, слухача, народа.

**3.** М. Бахцін: літаратурны жанр па сваёй прыродзе адлюстроўвае найбольш устойлівыя, "векавечныя" тэндэнцыі развіцця літаратуры. У жанры заўсёды захоўваюцца элементы архаікі. Праўда, гэтая архаіка захоўваецца ў ім толькі дзякуючы яе абнаўленню. Жанр заўсёды той і не той, заўсёды стары і новы адначасова. Жанр адраджаецца і абнаўляецца на кожным новым этапе развіцця літаратуры і ў кожным індывідуальным творы жыццё жанру. Жанр жыве сучаснасцю, але заўсёды памятае сваё мінулае, свой пачатак. Жанр – прадстаўнік творчай памяці ў працэсе літаратурнага развіцця. Менавіта таму жанр і здольны забяспечыць адзінства і бесперапыннасць гэтага развіцця.

**4.** М. Бахцін: жанр з’яўляецца важнейшым звяном сувязі сацыяльнай рэчаіснасці і мастацкай рэальнасці, жанр робіць зразумелай рэчаіснасць, рэчаіснасць растлумачвае жанр.

**5.** Ю. Бораў: стыль у мастацтве – гэта не форма, не змест, не іх адзінства ў творы. Стыль – набор “генаў” культуры (духоўных прынцыпаў пабудовы твора, адбору і спалучэння моўных адзінак), які абумоўлівае тып культурнай цэласнасці. Стыль – імператыўны загад цэлага, які кіруе кожным элементам твора.

**6.** Ю. Бушмін: паняцце літаратурнага жанру фіксуе вядомую тыпавую супольнасць мастацкай структуры групы твораў, гэта агульнасць, якая валодае пэўнай гістарычнай устойлівасцю. Гаварыць аб жанравай прыродзе твора – гэта значыць усталёўваць наяўнасць аб'ектыўна існуючых сувязей паміж ім і іншымі роднаснымі яму творамі. Любая сукупнасць літаратурных жанравых утварэнняў у рамках пэўнага гістарычнага адрэзку часу дазваляе казаць аб дадзенай сукупнасці літаратурных з'яў як аб пэўнай жанравай сістэме.

**7.** М. Верлі: паміж рознымі жанрамі існуе цесная ўзаемасувязь, і прыналежнасць твора да пэўнага жанру можа адбывацца толькі па вонкавых прыкметах, вызначаных часам адвольна. Асабліва важным з’яўляецца тое, што сама “чысціня формы” нічога не вызначае, таму што жанр не з’яўляецца нейкай формай, якую варта толькі напоўніць.

**8.** В. Вінаградаў: праблема індывідуальнага стылю пісьменніка звязана з вылучэннем таго стылявога ядра, той сістэмы сродкаў выказвання, якая нязменна прысутнічае ў творах гэтага аўтара.Назіранні за зменай гэтай стылявой

Репозиторий ВГУ

сістэмы ў творах таго ж аўтара даюць матэрыял для заключэнняў аб паслядоўнай эвалюцыі аўтарскага стылю.

**9.** В. Вінаградаў: стыль пісьменніка ці літаратурнага твора ўяўляе сабой непарыўнае адзінства кампанентаў, комплекс тыповых прыкмет. Індывідуальны стыль пісьменніка – гэта сістэма індывідуальна-эстэтычнага выкарыстання ўласцівых дадзенаму перыяду развіцця мастацкай літаратуры сродкаў слоўнага выражэння. Формай выражэння ўнутраных індывідуальных уласцівасцей і творчых магчымасцяў аўтара і з'яўляецца стыль.

**10.** В. Вінаградаў: у мастацкім творы могуць і павінны адлюстроўвацца сляды гістарычнай своеасаблівасці жыцця аўтара, своеасаблівасці яго біяграфіі, стыль яго паводзінаў, яго светаразуменне.

**11.** В. Вінаградаў: індывідуальны стыль - гэта сістэма эстэтычна-творчага падбору, асэнсавання і размяшчэння розных маўленчых элементаў. Індывідуальны стыль можа стаць асновай стылю цэлай літаратурнай школы, а потым выявы гэтага стылю нярэдка распадаюцца і спрыяюць умацаванню розных шаблонаў у сістэме літаратурнай мовы.

**12.** В. Вінаградаў: творчасць пісьменніка, яго аўтарская асоба, яго героі, тэмы, ідэі і вобразы ўвасоблены ў яго мове і толькі ў ёй і праз яе могуць быць спасцігнуты. Даследаванне стылю, паэтыкі пісьменніка, яго светапогляду немагчыма без грунтоўнага, тонкага валодання яго мовай.

**13.** Дз. Гальмакоў: своеасаблівасць аўтарскага стылю самым непасрэдным чынам залежыць ад характару мастацкай моўнай манеры пісьменніка. Яна абумоўлена шырынёй і шматграннасцю сувязей індывідуальнага почырку мастака з невычэрпным багаццем агульнанароднай мовы. У кожным стылі як цэласным ідэйна-мастацкім адзінстве выяўлены заканамернасці пераходу жыццёвага зместу ў мастацкую форму. Стыль – не толькі выяўленне светапогляду і творчай індывідуальнасці пісьменніка, але і яго адносіны да рэчаіснасці.

**14.** І. В. Гётэ: стыль азначае сабой вышэйшую ступень развіцця творчай індывідуальнасці. Стыль – гэта пазнанне сутнасці рэчаў.

**15.** М. Гіршман: стыль можа быць дадаткова вызначаны як выражэнне аўтарскай прысутнасці ў кожным значным элеменце твора, як матэрыяльна ўвасоблены і творча пазначаны «след» аўтарскай актыўнасці, які ўтварае і арганізуе мастацкую цэласнасць. Стылявое адзінства літаратурнага твора найбольш праяўляецца ў мастацкай мове і кампазіцыі. Аднак неабходна выявіць абагульняючыя якасці і ўласцівасці, якія ахопліваюць розныя элементы і надаюць ім канкрэтнае стылявое значэнне.

**16.** П. Дзюбайла: у сферы стылю і традыцыі маюць асаблівае значэнне. Тут кожны новы крок немагчымы без апоры на трывалы грунт стылявой традыцыі. Гэта адносіцца і да тых выпадкаў, калі стылявую традыцыю не наследуюць, а толькі ад яе адштурхоўваюцца. Стылявыя формы, гэтак жа як і

Репозиторий ВГУ

жанравыя, вельмі ўстойлівыя. Таму тут любое наватарства праяўляецца паступова, у арганічным спалучэнні новага і традыцыйнага.

**17.** В. Жырмунскі: прыкметы жанру ахопліваюць усе бакі твора. У іх уваходзяць асаблівасці кампазіцыі, пабудова твора, але таксама асаблівасці тэмы …калі мы гаворым аб жанры як тыпе літаратурнага твора, мы не абмяжоўваемся кампазіцыяй, а маем на ўвазе вызначаны традыцыяй тып спалучэння пэўнай тэмы з кампазіцыйнай формай і асаблівасцямі паэтычнай (мастацкай) мовы.

**18.** В. Кожынаў: стыль – гэта суадносіны элементаў, дзякуючы якім у вобразнасці твора ўзнікаюць адзіныя і разам з тым асноўныя рысы і ўласцівасці, і адначасова стыль – гэта сістэма гэтых асноўных якасцяў.

**19.** А. Лосеў: Стыль не зводзіцца толькі да вобраза, ідэі, формы, зместу ці да іх сукупнасці. Бо інакш, стылем можна лічыць што заўгодна на свеце, так як няма аб'екта, які б не меў гэтых якасцей. Стыль дыялектычна звязвае ўнутранае і знешняе. Стыль ёсць аснова, што абумоўлівае арганізацыю формы, і сама гэтая арганізацыя.

**20.** Г. Няфагіна: у дынамічнай сістэме літаратуры канца 20 стагоддзя адбываецца ўзаемапранікненне жанру і стылю, жанрава-стылявая дыфузія. У літаратуры канца 20 стагоддзя мае месца не столькі жанравы сінтэз, колькі сінэстэзія – выхад за жанравыя межы твора з наданнем неўласцівых яму ад прыроды магчымасцей сумежных форм і нават іншых мастацтваў.

**21.** Г. Поспелаў: кожны пісьменнік мае свае асабістыя псіхалагічныя ўласцівасці, свой жыццёвы вопыт, свой узровень і асаблівасці творчага таленту, свой шлях у мастацтве, які выяўляецца, у прыватнасці, у засваенні пэўных мастацкіх традыцый.

**22.** Г. Поспелаў: калі пісьменнік валодае нейкай творчай самабытнасцю, гэта выклікае ўзнікненне адпаведных асаблівасцей зместу і формы яго твораў, якія адрозніваюць іх ад твораў усіх іншых пісьменнікаў. Таму неабходна захаваць у літаратуразнаўстве і крытыцы і паняцце стылю, і паняцце індывідуальнай творчай манеры. Стыль як адзінства некаторых агульных прынцыпаў арганізацыі ўсіх бакоў формы мастацкіх твораў заўсёды ажыццяўляецца ў індывідуальнай творчай манеры, уласцівай творам асобнага пісьменніка.

**23.** Г. Поспелаў: стыль як гісторыка-літаратурная з'ява – гэта пэўныя агульныя прынцыпы арганізацыі мастацкай формы, якія заканамерна вынікаюць з пэўных агульных асаблівасцей ідэйнага зместу і якія могуць узнікнуць у творчасці розных пісьменнікаў адной літаратурнай плыні. Манера – гэта прыёмы арганізацыі мастацкай формы, уласцівыя творам асобнага пісьменніка, часам нават асобнага перыяду яго творчасці, у якіх рэалізуюцца агульныя заканамернасці таго ці іншага стылю.

Репозиторий ВГУ

**24.** А. Сакалоў: стыль ёсць мастацкая заканамернасць, якая аб’ядноўвае ў якасці яго носьбітаў усе элементы формы мастацкага цэлага і вызначаецца яго ідэйна-вобразным зместам, мастацкім метадам і жанрам дадзенага цэлага.

**25.** Б. Тамашэўскі: жанры жывуць і развіваюцца. Якая-небудзь першапачатковая прычына прымусіла адасобіцца шэраг твораў у асобны жанр. Прычына, што вылучыла дадзены жанр, можа знікнуць, асноўныя прыкметы жанру могуць паступова змяняцца, але жанр працягвае жыць генетычна, г. зн. паводле звыклага далучэння новых твораў да ўжо існуючых. Жанр зведвае эвалюцыю, а часам і рэзкую рэвалюцыю.

**26.** Б. Тамашэўскі: у змене жанраў цікава пастаяннае выцясненне высокіх жанраў нізкімі. Гэтае выцясненне адбываецца ў дзвюх формах: 1) поўнае адміранне высокага жанру. Так зніклі ў XIX ст. ода і эпапея XVIII ст.; 2) пранікненне ў высокі жанр прыёмаў нізкага жанру. Так ў эпічную паэму XVIII ст. пранікалі элементы парадыйных і сатырычных паэм.

**27.** Б. Тамашэўскі: вяртаючыся да паняцця жанру як генетычна вызначанага адасаблення літаратурных твораў, што аб’ядноўваюцца пэўнай агульнасцю прыёмаў з дамінуючымі прыёмамі-прыкметамі, мы бачым, што ніякай лагічнай і цвёрдай класіфікацыі жанраў правесці нельга. Іх размежаванне заўсёды гістарычна, г. зн. справядліва толькі для асобнага гістарычнага моманту; апроч гэтага, іх размежаванне адбываецца адразу па многіх прыкметах, прычым прыкметы аднаго жанру могуць быць абсалютна з іншай сферы, чым прыкметы другога жанру.

**28.** В. Халізеў: працэс “кананізацыі нізкіх жанраў” хоць і не ўніверсальны закон, але тыповы… Перыяду творчага росквіту літаратуры папярэднічае павольны працэс назапашвання сродкаў абнаўлення літаратуры ў нізкіх, непрызнаных літаратурных пластах. З’яўленне “генія” – гэта заўсёды своеасаблівая літаратурная рэвалюцыя, калі звяргаецца пануючы канон і ўлада пераходзіць да падпарадкаваных дагэтуль прыёмаў. Наадварот, прыхільнікі высокіх літаратурных напрамкаў, якія старанна паўтараюць прыём сваіх вялікіх настаўнікаў, звычайна ўяўляюць сабой далёка не прывабную карціну эпігонства.

**29.** В. Халізеў: літаратура ведае два віды жанравых структур. Гэта, па-першае, гатовыя, завершаныя, цвёрдыя формы – кананічныя жанры (санет), і, па-другое, жанравыя формы некананічныя: гнуткія, адкрытыя любым трансфармацыям, перабудовам (элегіі, навелы). Гэтыя свабодныя жанравыя формы ў блізкія нам эпохі судакранаюцца і суіснуюць з пазажанравымі ўтварэннямі, але без пэўнага мінімуму ўстойлівых структурных уласцівасцей жанраў не бывае.

**30.** А. Чычэрын: паняцце стылю мае на ўвазе адзінства слова і вобраза, вобраза і кампазіцыі, кампазіцыі і ідэй паэтычнага твора. Вывучэнне стылю немагчыма без філасофскага разумення адзінства зместу і формы, без сувязі з іншымі мастацтвамі, без сувязі з эстэтыкай. Паняцце стылю гістарычнае, яно мае на ўвазе пераемнасць, барацьбу і ўзаемаадносіны стыляў.

Репозиторий ВГУ

## ЛІТАРАТУРА

### А) Асноўная


1. Бароўка, В. Ю. Тэорыя літаратурнага працэсу : вучэб. дапам. для студ. філал. спец. / В. Ю. Бароўка. – Віцебск: Выд-ва ВДУ, 2001. – 32 с.
2. Введение в литературоведение: хрестоматия / [сост.: П. А. Николаев, Е. Г. Руднева, В. Е. Хализев [и др.]]; под ред. П. А. Николаева, А. Я. Эсалнек. - Изд. 4-е, перераб. и доп. – Москва: Высшая школа, 2006. - 463 с.
3. Корань, Л.Дз. Беларуская проза ХХ стагоддзя: Дынаміка жанравых структур / Л.Дз.Корань. – Мінск: ВПП "Новік", 1996. – 220 с.
4. Поспелов, Г.Н. Проблемы литературного стиля / Г.Н. Поспелов. – М.: Изд-во Моск. ун-та, 1970. – 332 с.
5. Поспелов, Г.Н. Теория литературы / Г.Н. Поспелов. – М.: Высш. шк., 1978. – 351 с.
6. Рагойша, В. П. Уводзіны ў літаратуразнаўства: вучэб. дапам. для студ. выш. навуч. уст.: у 2 ч. Ч. 1: Літаратуразнаўства як навука. Эстэтыка літаратуры. Паэтыка / В. П. Рагойша. – Мінск: БДУ, 2011. – 247 с.
7. Теория литературы: учеб. пособие для студ. высш. учеб. зав.: в 2 т. Т.1: Теория художественного дискурса. Теоретическая поэтика / Н.Д. Тамарченко, В.И. Тюпа, С.Н. Бройтман / под ред. Н.Д. Тамарченко. – М.: Академия, 2004. - 510 с.
8. Хализев, В. Е. Теория литературы: учеб. для студ. вузов / В. Е. Хализев. – М.: Высшая школа, 2000. – 398 с.


### Б) Дадатковая


1. Аристотель Поэтика. Риторика / Аристотель. – СПб.: Азбука, 2000. – 352 с.
2. Бахтин, М. М. Собрание сочинений: В 7 т. Т. 5: Работы 1940-х - начала 1960-х годов / М. М. Бахтин. – М.: Русские словари, 1997. – 731с.
3. Бахтин, М.М. Проблемы поэтики Достоевского / М.М. Бахтин. – М.: Художеств. лит., 1972. – 472 с.
4. Виноградов, В. В. О языке художественной прозы: избр. труды / В. В. Виноградов. – Москва: Наука, 1980. – 360 с.
5. Виноградов, В.В. Проблема авторства и теория стилей / В.В. Виноградов. – М.: Гослитиздат, 1961. – 614 с.
6. Гальмакоў, Дз.У. Стыль прозы Якуба Коласа / Дз.У. Гальмакоў. – Мінск: Выд-ва Беларус. дзярж. ун-та, 1973. – 223 с.
7. Дзюбайла, П.К. Праблема стылю ў сучаснай беларускай прозе / П.К. Дзюбайла. – Мінск: Навука і тэхніка, 1973. – 176 с.
8. Копыстянская, Н.Ф. Жанровые модификации в чешской литературе / Н.Ф. Копыстянская. – Львов: Вища шк., 1978. – 260 с.
9. Лейдерман, Н.Л. Движение времени и законы жанра: Монография / Н.Л. Лейдерман. – Свердловск: Сред.-Урал. кн. изд-во, 1982. – 256 с.
10. Лосев, А.Ф. Проблема художественного стиля / А.Ф. Лосев. – Киев: Киев. акад. евробизнеса, 1994. – 288 с.
11. Макаревич, А. Н. В разных стилевых течениях: Проблема жанра и стиля в рассказах 20-х годов М.Горецкого и Т.Гартного / А. Н. Макаревич. – Екатеринбург: Урал Плюс, 1995. – 178 с.
12. Макарэвіч, А.М. Праблема жанравых мадыфікацый у беларускай прозе ХІХ – пачатку ХХ ст. / А.М. Макарэвіч. – Магілёў: Выд-ва Магілёўс. дзярж. ун-та, 1999. – 332 с.


Репозиторий ВГУ

13. Мищенчук, Н. И. Русская и белорусская литературы XIX-XX столетий: жанрово-стилевой аспект, вопросы взаимодействия : монография / Н. И. Мищенчук. – Брест: Изд-во БрГУ, 2005. – 163 с.
14. Падстаўленка, В. Ф. Беларуская сатырычная проза 20-30-х гадоў XX ст.: жанрава-стылёвыя асаблівасці: вучэб. дапаможнік / В. Ф. Падстаўленка. – Віцебск : Выд-ва УА "ВДУ імя П. М. Машэрава", 2005. – 111 с.
15. Стыль пісьменніка: Зб. арт. / Рэд.: В.В. Барысенка, П.К. Дзюбайла. – Мінск: Навука і тэхніка, 1974. – 448 с.
16. Томашевский, Б. В. Краткий курс поэтики / Б. В.Томашевский. – Москва : КДУ, 2006. – 191 с.
17. Фрейденберг, О.М. Поэтика сюжета и жанра / О.М. Фрейденберг. – М.: Лабиринт, 1997. – 448 с.
18. Эйдинова, В. Стиль художника: Концепция стиля в литературной критике 20-х годов / В.Эйдинова. – М.: Художеств. лит., 1991. – 285 с.

**Пытанні**

да заліку па "*Тэорыі жанру і стылю*" для студэнтаў I, IV курсаў спецыяльнасці "Беларуская філалогія (літаратурна-рэдакцыйная дзейнасць)"

1. Эвалюцыя паняцця *жанру*.
2. Эвалюцыя паняцця *стылю*.
3. Сучаснае разуменне тэрміна *стыль*.
4. Сучаснае разуменне тэрміна *жанр*.
5. Фактары і перадумовы фармавання жанрава-стылявой сістэмы ў сусветнай мастацкай практыцы.
6. Узаемасувязь катэгорый *жанр – стыль*, варыятыўнасць іх узаемадзеяння.
7. Тыпалагічнае і гістарычна-канкрэтнае ў жанраўтварэнні.
8. Амбівалентнасць жанравай прыроды.
9. Праблема жанравых межаў.
10. Уплыў сацыякультурнай сітуацыі і сусветнай жанрава-стылявой экспансіі на беларускую літаратуру.
11. Стыль як вышэйшая эстэтычная якасць мастацкіх твораў.
12. Сістэма стылявых дамінант.
13. Кампаненты стылю.
14. Навуковыя вопыты сістэматызацыі жанраў.
15. Заканамернасці фарміравання жанравых сістэм.
16. Праблема "сінтэтычных", змешаных жанраў (на прыкладзе беларускай літаратуры XX – пач. XXI ст.).

Репозиторий ВГУ

**ЗМЕСТ**

Тлумачальная запіска......................................................................................3

Кароткі курс выбраных лекцый..............................................................4-6

Тэматычны змест лекцый.........................................................................6-7

Тэматыка практычных заняткаў.............................................................7-12

Тэарэтычны матэрыял для замацавання вучэбнай дысцыпліны……13-16

Літаратура…………………………………………………………….….17-18

Пытанні да заліку……………………………………………………18

Репозиторий ВГУ

Вучэбнае выданне

Падстаўленка Віталь Феліксавіч

Тэорыя жанру і стылю

Метадычныя рэкамендацыі

Тэхнічны рэдактар
Карэктар
Камп'ютарны дызайн

Падпісана ў друк 2013 г. Фармат Папера афсетная. Гарнітура Таймс. Рызаграфія. Ум. Друк. Арк. Ул.-выд. друк. Арк. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне – установа адукацыі "Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава"
ЛВ № 02330/0494385 ад 16.03.2009

Надрукавана на рызографе ўстановы адукацыі "Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава"
210038, г. Віцебск, Маскоўскі праспект, 33

Репозиторий ВГУ